Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 12–17

УДК [94(476):373.5]"1943/1945"

# АДНАЎЛЕННЕ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1943–1945 гг.

**І. А. Андарала,**
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі*
*і паліталогіі БДТУ*

Паступіў у рэдакцыю 23.03.20

UDC [94(476):373.5]"1943/1945"

# RENEWING OF SCHOOL EDUCATION IN BELARUS IN 1943–1945

**I. Andarala,**
*PhD in Pedagogic, Associate Professor*
*of the Department of the History of Belarus*
*and Political Science, BSTU*

Received on 23.03.20.

У артыкуле на аснове вывучэння архіўных матэрыялаў разглядаецца працэс адраджэння школьнай адукацыі на вызваленай тэрыторыі Беларусі ў пасляваенныя гады. Аналізуюцца вынікі знішчэння і разбурэння школьнай гаспадаркі, умовы і праблемы, якія суправаджалі аднаўленне сеткі агульнаадукацыйных школ, іх матэрыяльнай базы, вучэбна-метадычнага і кадравага забеспячэння, ахопу навучаннем дзяцей школьнага ўзросту, асаблівасці арганізіцыі і функцыянавання працэсу навучання ў агульнаадукацыйных школах.

*Ключавыя словы:* адукацыя, школа, матэрыяльная база, вучэбны працэс, педагагічныя кадры.

Based on studying the archive materials the article considers the process of revival of school education in the emancipated territory of Belarus in postwar years. It analyzes the results of termination and ruining of school household, conditions and problems that followed the renewing of the network of comprehensive schools, their material base, learning-methodical and personnel supply, spreading educating of schoolchildren, the features of organization and functioning of the process of learning at comprehensive schools.

*Keywords:* education, school, material base, education process, pedagogical personnel.

*Уводзіны.* Нацыянальная сістэма агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца найважнейшым сацыяльным інстытутам, які аказвае істотны ўплыў не толькі на выхаванне творчай асобы, здольнай да сацыяльнага і прафесійнага самавызначэння, хуткай і дакладнай адаптацыі ў бесперапынна зменлівым грамадстве, самарэалізацыі свайго духоўнага патэнцыялу і фізічных магчымасцей, але і на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў цэлым.

Сучасны перыяд у гісторыі Беларусі характарызуецца глыбокімі пераўтварэннямі ва ўсіх сферах жыцця рэспублікі, якія патрабуюць ажыццяўлення пастаянных трансфармацыйных працэсаў у сістэме сярэдняй агульнай адукацыі. Як следства, забеспячэнне бесперапыннага прагрэсу ў развіцці агульнаадукацыйнай сферы краіны з'яўляецца адной з найважнейшых задач дзяржавы. Рашэнне гэтай задачы вызначае неабходнасць распрацоўкі інавацыйнай тэарэтыка-метадалагічнай дзяржаўнай палітыкі, пошуку новых, арыгінальных шляхоў і форм развіцця агульнай адукацыі, адпаведнай духу і часу сувярэннай Беларусі.

Трансфармацыя сістэмы агульнаадукацыйнай школы рэспублікі ў адпаведнасці з новымі гістарычнымі рэаліямі не можа адбывацца ў адрыве ад папярэдняй гістарычнай практыкі і атрыманага вопыту арганізацыі школьнага навучання. Выключна важным для вызначэння перспектыў далейшага развіцця нацыянальнай агульнаадукацыйнай школы з'яўляецца ўсебаковае вывучэнне і аб'ектыўная ацэнка пазітыўнага і негатыўнага вопыту фарміравання і рэалізацыі школьнай палітыкі ў савецкі перыяд. Асаблівую цікавасць выклікае праблема аднаўлення школьнай адукацыі рэспублікі ў пасляакупацыйныя гады. Яны былі выключна складанымі ў развіцці сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, што тлумачыцца іх своеасаблівасцю.

*Асноўная частка.* На пачатак 1940/41 навучальнага года сістэма агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі аб'ядноўвала 13 043 школы. З іх пачатковых – 9229; сямігадовых – 2841; сярэдніх – 973. Ва ўсіх тыпах школ навучалася 1 826 129 вучняў. У 1–4 – 1 281 363; 5–7 – 455 847; 8–10 – 88 919 чал. Агульная колькасць настаўнікаў, якія забяспечвалі вучэбны працэс, складала 60 724 чал. [1, л. 184].

Паступальнае развіццё школьнай адукацыі рэспублікі перапыніла Вялікая Айчынная вайна. Створаная ў даваенныя гады сістэма школьнай адукацыі Беларусі ў выніку вайны і нямецкай акупацыі тэрыторыі рэспублікі была практычна знішчана. Нямецкімі захопнікамі было спалена і разбурана 6808 школ, або больш за 50 % даваеннай колькасці, у тым ліку ўсе сямігадовыя і сярэднія школы разам з абсталяваннем, вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, падручнікамі, бібліятэкамі. У такіх раёнах, як Бягомльскі і Плешчаніцкі Мінскай вобласці, Лельчыцкі і Капаткевіцкі Палескай вобласці, Суражскі і Лёзненскі Віцебскай вобласці акупанты знішчылі ўсе школьныя будынкі [1, л. 184].

Акрамя матэрыяльнага, агульнаадукацыйнай школе рэспублікі быў нанесены істотны кадравы ўрон. Многія з настаўнікаў, якія знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі, былі расстраляны, павешаны, вывезены на працу ў Германію. Аб маштабах рэпрэсій у дачыненні да настаўнікаў яскрава сведчыць той факт, што толькі ў Баранавіцкай вобласці фашысты знішчылі 248 настаўнікаў і 83 вывезлі ў Германію [2, л. 12].

Аднаўленне разбуранай вайной і акупацыяй школьнай адукацыі рэспублікі пачалося восенню 1943 г. у раёнах, часткова вызваленых Палескай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Каардынацыю гэтай дзейнасці ажыццяўлялі рэспубліканскія, абласныя і раённыя партыйна-савецкія органы. Непасрэднымі арганізатарамі работ па аднаўленні сеткі школ і іх дзейнасці былі апараты абласных, раённых і гарадскіх аддзелаў народнай адукацыі. Першачарговая задача, якая ставілася перад імі, заключалася ў хутчэйшым узнаўленні работы школ і забеспячэнні ўсенавуча на ўзроўні пачатковага навучання.

Асноўным стрымліваючым фактарам у справе арганізацыі дзейнасці агульнаадукацыйных школ на часткова вызваленай тэрыторыі з'яўляўся выключна востры дэфіцыт прыдатных для вучэбных заняткаў памяшканняў. Большая частка школьных будынкаў была знішчана акупантамі, а многія ўцалелыя даваенныя школьныя памяшканні былі заняты адміністрацыйнымі арганізацыямі і ўстановамі, ваеннымі часцямі, шпіталямі. Спробы органаў асветы вярнуць памяшканні для мэтавага выкарыстання натыкаліся на супраціўленне тых структур, якія іх выкарыстоўвалі. Пэўную пасіўнасць у гэтай справе праяўлялі і мясцовыя ўлады.

Ва ўмовах ваеннага часу праблема наяўнасці школьных памяшканняў, як правіла, вырашалася не шляхам будаўніцтва школьных будынкаў, а праз рамонт і прыстасаванне існуючых памяшканняў, а ў сельскай мясцовасці ў асноўным выкарыстаннем для пачатковых школ хат сельскіх жыхароў, зямлянак і бліндажоў. Аднаўленчы працэс, не падмацаваны фінансавымі, матэрыяльнымі і працоўнымі рэсурсамі, фактычна грунтаваўся на энтузіязме насельніцтва. Вакол школы ўзнікла своеасаблівая атмасфера дабрачыннасці. Настаўнікі, вучні старшых класаў і іх бацькі рамантавалі школьныя памяшканні, выраблялі мэблю і абсталяванне, збіралі падручнікі, нарыхтоўвалі дровы. Шэфскую дапамогу аказвалі прадпрыемствы, калгасы, саўгасы, вайскоўцы.

Акрамя дэфіцыту школьных плошчаў, пасляакупацыйнае аднаўленне школьнага навучання стрымлівалася і па прычыне адсутнасці педагагічных кадраў. У гэтых умовах у якасці настаўнікаў прыходзілася выкарыстоўваць людзей, якія не мелі нават і сярэдняй адукацыі.

Школы пачыналі працаваць без вучэбных планаў, вучэбных праграм, падручнікаў, пісьмовых прыналежнасцей. Сур'ёзнай праблемай было дрэннае ацяпленне школьных памяшканняў. У зімовы перыяд у многіх, асабліва сельскіх, школах у класах было холадна і вучням даводзілася вучыцца ў верхнім адзенні. Па гэтай прычыне зімой 1943/44 навучальнага года значная колькасць школ часова прыпыняла вучэбны працэс, што прыводзіла да парушэння яго рытмічнасці і адмоўна ўплывала на паспяховасць школьнікаў.

Аднаўленню школьнай адукацыі на вызваленай тэрыторыі Беларусі ўдзялялася значная ўвага з боку партыйнага і савецкага кіраўніцтва дзяржавы. Аб гэтым сведчыць прынятая 1 студзеня 1944 г. сакрэтная пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і ЦК КП(б)Б», згодна з якой партыйна-савецкаму кіраўніцтву Беларусі даручалася «аднавіць у 1944 г. у вызваленых раёнах сетку пачатковых і сярэдніх школ, ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту» [3, с. 37]. На правядзенне ў 1944 г. капітальных работ па аднаўленні школьнай гаспадаркі СНК СССР у складаных умовах ваеннага часу выдаткаваў НКА БССР спачатку15 мільёнаў руб. [4, л. 7], а затым для Палескай, Гомельскай і Віцебскай абласцей яшчэ 5 мільёнаў руб. [4, л. 30]. Пэўную станоўчую ролю ў пашырэнні сеткі школ і паляпшэнні іх матэрыяльнай базы аказала пастанова СНК СССР «Аб парадку вяртання школьных памяшканняў, якія выкарыстоўваюцца не па прызначэнні», прынятая ў сакавіку 1944 г. Улічваючы складанае становішча ў краіне, займаць школьныя памяшканні дазвалялася шпіталям і арганізацыям толькі па спецыяльным дазволе СНК СССР і ЦК ВКП(б). Па прычыне адсутнасці належнага кантролю за выкананнем адзначанай пастановы вяртанне сістэме адукацыі школьных памяшканняў па розных прычынах адбывалася даволі павольна. Так, на 1 верасня 1944 г. нават у Мінску 4 будынкі школ з 23 заставаліся занятымі не па мэтавым прызначэнні [5, л. 2].

Пытанні, звязаныя з аднаўленнем школьнай сеткі і работы агульнаадукацыйных школ, рэгулярна разглядаліся на пленумах, бюро камітэтаў партыі і былі пад іх непасрэдным кантролем. Аднак у цэлым па рэспубліцы, як вынікае з загаду народнага камісара асветы Беларускай ССР Е. І. Уралавай ад 8 сакавіка 1944 г. «Аб ходзе аднаўлення школ у вызваленых раёнах БССР», у справе аднаўлення школьнай адукацыі меліся істотныя недахопы. У прыватнасці ў загадзе адзначалася: «Нездавальняюча пастаўлена работа аб усенавучы. Вялікая колькасць дзяцей 8–12-гадовага ўзросту ў школах не вучыцца; пры адкрыцці сямігадовых і сярэдніх школ не ўлічваецца наяўнасць памяшканняў, адпаведных педагагічных кадраў і адпаведнага кантынгенту навучэнцаў; гаспадарчае ўпарадкаванне школ праводзіцца нездавальняюча. Абсталяванне не выраблялецца; у шэрагу раёнаў метадычная работа не арганізавана» [6, л. 168]. Асабліва складана вырашалася пытанне з рамонтам і будаўніцтвам школ. Па прычыне адсутнасці кваліфікаванай рабочай сілы і транспарту капітальныя работы па будаўніцтве школьных будынкаў у рэспубліцы практычна не вяліся. Будаўнічыя работы на месцах ажыццяўляліся выключна гаспадарчым спосабам і ў нязначным аб'ёме [1, л. 315].

З мэтай выпраўлення становішча СНК БССР і ЦК КП(б)Б 18 красавіка 1944 г. прынялі пастанову № 211/5 «Аб аднаўленні сеткі школ у вызваленых ад нямецкіх акупантаў раёнах БССР». Гэты дакумент абавязваў партыйныя і савецкія органы ўсіх узроўняў, народны камісарыят асветы, аддзелы народнай адукацыі рэспублікі актывізаваць работу па аднаўленні даваеннай сеткі агульнаадукацыйных школ. НКА было даручана да пачатку 1944/45 навучальнага года падрыхтаваць вучэбныя планы, вучэбныя праграмы, забяспечыць школы падручнікамі, сшыткамі, асаблівая ўвага звярталася на камплектаванне школ педагагічнымі кадрамі. Раённыя выканаўчыя саветы і органы народнай адукацыі павінны былі правесці ўлік і ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту, адрамантаваць школьныя будынкі і памяшканні, забяспечыць школы палівам, арганізаваць пашыў вопраткі і абутку для школьнікаў. Народным камісарыятам лёгкай, лясной, мясцовай прамысловасці даручалася пачаць выраб школьнага абсталявання, вытворчасць школьна-пісьмовых прыналежнасцей і дапаможнікаў.

Прынятая савецка-партыйным кіраўніцтвам рэспублікі дадзеная пастанова адыграла мабілізуючую ролю, паколькі вызначыла прыярытэтныя задачы ў аднаўленні агульнай сярэдняй адукацыі на вызваленай ад акупантаў тэрыторыі рэспублікі і спосабы іх вырашэння. Аднак прыняты ва ўмовах эйфарыйных спадзяванняў на хуткае вызваленне Беларусі ад захопнікаў дакумент не ў поўнай меры ўлічваў рэальны стан вызваленых раёнаў і магчымасці рэспублікі забяспечыць выкананне пастаўленых задач. Як вынік, рэалізацыя прадугледжаных вышэйназванай пастановай мерапрыемстваў па аднаўленні школьнай адукацыі

ў поўным аб'ёме аказалася нерэальнай, што і пацвердзіла практыка.

Большасць сельскіх пачатковых школ працягвала размяшчацца ў неадрамантаваных і непрыстасаваных памяшканнях. Адсутнасць матэрыялаў і вытворчай базы не дазволілі арганізаваць выданне падручнікаў, выраб школьнай мэблі і пісьмовых прылад. 20 965 дзяцей школьнага ўзросту на канец навучальнага года засталіся не ахопленымі вучобай [1, л. 326]. Значная колькасць школ на вызваленай тэрыторыі не змагла аднавіць сваю работу па прычыне адсутнасці настаўніцкіх кадраў. Многія з настаўнікаў не мелі педагагічнай адукацыі. Так, у школах Гомельскай вобласці працавалі 368 настаўнікаў з агульнай сярэдняй адукацыяй і 736 настаўнікаў, якія не мелі закончанай сярэдняй адукацыі [7, л. 13].

Паколькі агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы аднаўлялі сваю дзейнасць па меры вызвалення тэрыторыі рэспублікі, то ў школах многіх раёнаў вучэбны год пачаўся значна пазней за верасень. У гэтых школах новы праграмны вучэбны матэрыял не вывучаўся. На ўроках паўтаралася тое, што вывучалася ў даваенныя гады. У выніку, з агульнай колькасці працаваўшых у 1943/44 навучальным годзе школ праграмны матэрыял па вучэбных дысцыплінах быў засвоены толькі ў 586 школах [1, л. 327]. Іспыты, што праводзіліся вясной 1944 г. у школах Брагінскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў, паказалі, што ва ўмовах адсутнасці падручнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў, нізкай кваліфікацыі настаўнікаў засвоіць праграмны матэрыял на належным узроўні школьнікам не ўдалося. Па гэтай прычыне іспыты ў многіх школах былі адменены [8, л. 35].

Галоўнае, што атрымалася здзейсніць да канца першага пасляакупацыйнага года, – гэта аднавіць у вызваленых раёнах работу значнай колькасці ў асноўным пачатковых школ і арганізаваць у іх вучэбныя працэсы для большай часткі дзяцей школьнага ўзросту.

Так, у чэрвені 1944 г. у вызваленых раёнах Магілёўскай вобласці працавалі 432 пачатковыя школы, 85 няпоўных сярэдніх і 16 сярэдніх школ. З іх 168 пачатковых школ размяшчаліся ў прыстасаваных будынках, у тым ліку і зямлянках. Вучобай было ахоплена 53 626 чалавек: у 1–4 класах – 42 030, у 5–7 – 10 380 і ў 8–10 – 1216 вучняў [8, л. 48].

У Палескай вобласці на канец 1943/44 навучальнага года аднавілі дзейнасць 332 школы. З іх: у пачатковых – 268, сямігадовых – 58, сярэдніх – 6. Вучобай ва ўсіх тыпах школ быў ахоплены 31 051 чал. з 43 849 дзяцей школьнага ўзросту, якія падлягалі абавязковаму навучанню [8, л. 33].

У цэлым па рэспубліцы, па даных наркамасветы, у канцы 1943/44 навучальнага года працавала 1458 школ з агульным кантынгентам навучэнцаў 147 092 чал., у тым ліку 1146 пачатковых з кантынгентам 122 271 чал., 267 сямігадовых – 22 798 чал. і 45 сярэдніх – 2489 чал. [1, л. 325].

Пасля завяршэння першага пасляакупацыйнага вучэбнага года адразу пачалася непасрэдная падрыхтоўка школьнай адукацыі да новага 1944/45 навучальнага года. Яна ажыццяўлялася па трох асноўных кірунках: улік дзяцей, якія падлягалі ўсеагульнаму абавязковаму навучанню (7–15-гадовага ўзросту); аднаўленне разбуранай нямецкімі захопнікамі сеткі школ; падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў [1, л. 339].

З мэтай якаснай падрыхтоўкі школьнай адукацыі да пачатку 1944/45 навучальнага года абласныя камітэты партыі і выканкамы абласных саветаў прынялі сумесныя пастановы, у якіх у разрэзе кожнага раёна былі вызначаны аб'екты школьнага будаўніцтва і рамонту. Перад мясцовымі ўладамі і органамі народнай адукацыі была пастаўлена задача: да пачатку 1944/45 навучальнага года правесці ўлік і ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту, вырашыць пытанні з забеспячэннем школ мэбляй, палівам, арганізацыяй пашыву вопраткі і абутку для школьнікаў. Так, Магілёўскі абкам КП(б)Б і аблвыканкам прынялі сумесную пастанову, згодна з якой планавалася да пачатку 1944/45 навучальнага года адрамантаваць і аднавіць дзейнасць 99 пачатковых школ, 8 сямігадовых і 5 сярэдніх, правесці ўкамплектаванне іх настаўніцкімі кадрамі, нарыхтаваць для школ неабходную колькасць дроў [8, л. 53].

Згодна з пастановамі, прынятымі абласнымі партыйна-савецкімі кіруючымі структурамі, абласныя аддзелы народнай адукацыі распрацавалі і ажыццявілі мерапрыемствы ў межах сваіх паўнамоцтваў. Напрыклад, Мінскі абласны аддзел народнай адукацыі правёў нараду з загадчыкамі раённых аддзелаў народнай адукацыі, на якой былі абмеркаваны першачарговыя задачы агульнаадукацыйных школ у новым навучальным годзе, накіраваў ва ўсе раёны інструкцыю НКА БССР і дырэктыўнае пісьмо абласнога аддзела народнай адукацыі аб парадку ўліку настаўніцкіх кадраў і дзяцей школьнага ўзросту, фінансавання школ; разам з абласным фінансавым аддзелам склаў план аднаўлення сеткі школ вобласці [5, л. 170].

Пэўную арганізацыйную работу па падрыхтоўцы да навучальнага года правёў наркамасветы рэспублікі. Каб зменшыць востры дэфіцыт педагагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ, летам 1944 г. была арганізавана падрыхтоўка настаўнікаў праз 3-х і 6-месячныя курсы. У выніку ў школы былі накіраваны 1222 настаўнікі [9, л. 25]. Таксама быў распрацаваны вучэбны план на 1944/45 навучальны год, у школы завезена 200 000 падручнікаў, 950 000 сшыткаў і на 120 000 руб. вучэбна-наглядных дапаможнікаў [1, л. 312].

Улічваючы вострую патрэбу настаўнікаў у вопратцы і абутку, Саўнаркам БССР узбудзіў хадайніцтва перад ЦК ВКП(б) аб выдзяленні спецыяльным прызначэннем для іх 7000 адзінак мануфактуры і абутку [1, л. 315].

Істотным стрымліваючым фактарам падрыхтоўкі школ да навучальнага года заставаўся дэфіцыт кваліфікаваных рабочых рук і будаўнічых матэрыялаў. У гэтых умовах значная частка работ па падрыхтоўцы школ да пачатку навучальнага года выконвалася сіламі грамадскасці пры актыўным удзеле настаўнікаў. Па ўсёй рэспубліцы праводзіліся суботнікі, нядзельнікі, дэкаднікі, у час якіх сельскія жыхары, настаўнікі і вучні рамантавалі і абсталёўвалі школьныя памяшканні, завозілі паліва, выраблялі і рамантавалі школьную мэблю, збіралі падручнікі. Звычайна такія мерапрыемствы ажыццяўляліся на добраахвотнай аснове, а партыйныя і савецкія органы толькі ініцыіравалі іх.

Адначасова з аднаўленнем школьнай гаспадаркі мясцовыя ўлады, раённыя аддзелы народнай адукацыі, педагагічныя калектывы школ праводзілі ўлік дзяцей школьнага ўзросту.

Для вырашэння складаных задач па аднаўленні школьнай адукацыі рэспублікі і падрыхтоўцы яе да пачатку 1944/45 навучальнага года патрабаваліся час, вялікія матэрыяльныя і людскія рэсурсы. Ва ўмовах іх адсутнасці дасягнуць значных поспехаў у аднаўленні школьнай гаспадаркі, ахопе ўсенавучам дзяцей школьнага ўзросту і вырашэнні праблемы кадравага забеспячэння школ да пачатку 1944/45 навучальнага года не атрымалася. Аднак, як вынікала з даведкі наркама асветы БССР Е. І. Уралавай сакратару ЦК КП(б)Б В. М. Маліну «Аб стане работы па аднаўленні сеткі культурных устаноў па Беларускай ССР» ад 5 кастрычніка 1944 г., сістэма школьнай адукацыі рэспублікі за выключна кароткі тэрмін змагла пасняхова вырашыць усе задачы, якія былі пастаўлены перад ёй, і якасна падрыхтавацца да пачатку навучальнага года. У даведцы адзначалася: «Па ўсёй рэспубліцы быў праведзены ўлік дзяцей школьнага ўзросту (7–15 год). Улічана 1 222 852 чал. За кароткі перыяд адноўлены і пачалі працаваць на 1 кастрычніка 1944 г. 10 594 школы, у тым ліку пачатковых – 8683, сямігадовых – 1636 і сярэдніх 279, з агульным ахопам навучэнцаў – 1 178 039 чал. У школах Беларусі ўжо працуе больш за 30 000 настаўнікаў. Усе школы працуюць у адрамантаваных, прыстасаваных школьных будынках. Амаль паўсямесна пачатковыя школы і малодшыя класы сямігадовых і сярэдніх школ пачалі вучэбны год з 1 верасня» [3, с. 211].

Трэба адзначыць, што інфармацыя, прадстаўленая Наркамам асветы ў ЦК КП(б)Б, не адлюстроўвала сапраўдны стан школьнай адукацыі рэспублікі на 1 верасня 1944 г.

Так, у Пінскай вобласці да пачатку 1944/45 навучальнага года планавалася адкрыць 510 школ, а пачалі працу толькі 358, або 70 % ад запланаванай колькасці. 152 школы не змаглі аднавіць сваю дзейнасць у асноўным па прычыне адсутнасці памяшканняў для іх і настаўнікаў, 196 школ пачалі вучэбны год у прыватных будынках [5, л. 148]. Такое становішча, як вынікае з даведкі загадчыка аддзела адукацыі Пінскай вобласці ў аддзел школ ЦК КП(б)Б, з'явілася следствам «адсутнасці дапамогі школам з боку мясцовых партыйна-савецкіх кіруючых органаў» [5, л. 149].

Згодна з усянавучам у школах вобласці павінны былі вучыцца ў 1–4 класах 60 110 чалавек, у 5–7 – 7951 чал. Да заняткаў жа ў пачатку навучальнага года прыступілі ў 1–4 класах 40 044 чал., у 5–7 – 5120. Такім чынам, 30 % дзяцей школьнага ўзросту засталіся неахопленымі вучобай [5, л. 148].

Для забеспячэння вучэбнага працэсу ў школах вобласці патрабаваўся 1591 настаўнік. З іх 1334 настаўнікі для пачатковых класаў і 257 – для сярэдніх і старшых класаў. У наяўнасці ж быў толькі 641 настаўнік пачатковай школы і 93 настаўнікі-прадметнікі. У цэлым недахоп настаўнікаў у школах вобласці на пачатак вучэбнага года складаў 857 чалавек, або больш за 50 % ад патрэбнай колькасці. Заставалася нявырашаным пытанне забеспячэння школ падручнікамі, вучэбна-наглядными дапаможнікамі, сшыткамі, алоўкамі [5, л. 148].

У Гродзенскай вобласці да пачатку 1944/45 навучальнага года планавалася адкрыць 847 школ – 728 пачатковых, 109 сямігадовых і 10 сярэдніх. Фактычна ж на 1 верасня 1944 г. у вобласці працавала 738 школ, з іх 637 пачатковых, 94 – сямігадовыя, 8 – сярэдніх. Такім чынам, не здолелі аднавіць сваю дзейнасць 109 школ, з іх 91 пачатковая школа. Вучобай з ліку дзяцей школьнага ўзросту не быў ахоплены 9981 чал., або 11 % ад улічаных [9, л. 1–2].

Аб нездавальняючым стане аднаўлення школьнай адукацыі рэспублікі сведчаць і матэрыялы праверкі, праведзенай брыгадай аддзела школ ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б у шэрагу абласцей на працягу студзеня 1945 г.

Напрыклад, у даведцы брыгады па праверцы становішча школьнай адукацыі Пінскай вобласці адзначалася, што будаўніцтва і рамонт школьных памяшканняў ажыццяўляўся вельмі марудна. З 1185 тыс. руб., выдзеленых на аднаўленне школ, за паўгода было патрачана толькі 211 тыс. руб. [9, л. 48]. У многіх раёнах гэтыя сродкі наогул не выкарыстоўваліся. У выніку з 26 разбураных будынкаў школ да 1 лютага 1945 г. у вобласці не аднавілі ні аднаго. Асобныя сельскія саветы Пінскага раёна, не жадаючы ажыццяўляць нават нязначны рамонт школьных будынкаў, наймалі для школьных патрэб нязручныя для вучэбнага працэсу памяшканні [9, л. 49]. У шэрагу школ вобласці па прычыне незавозу паліва дзеці на ўроках сядзелі ў паліто і шапках. Вучэбнанаглядными дапаможнікамі і школьнымі пісьмовымі прыналежнасцямі школы вобласці былі забяспечаны недастаткова. На працягу паўгода Пінскі абласны аддзел народнай адукацыі атрымаў толькі 100 566 сшыткаў, 10 000 алоўкаў, 4000 пёраў і 63 822 падручнікі [10, л. 50]. Аднак нават гэта нязначная колькасць выдзеленага ў поўным аб'ёме да школ не даходзіла. Так, у снежні з 48 000 сшыткаў, атрыманых вобласцю, 5000 былі забраны сакратаром абкама КП(б)Б па прапагандзе для свайго аддзела. Пасля ўмяшання першага сакратара абкама 3000 былі накіраваны ў школы [9, л. 50].

Вельмі складаным быў у вобласці і стан з педагагічнымі кадрамі. Па прычыне адсутнасці настаўнікаў у першым паўгоддзі не аднавілі дзейнасць 60 школ [9, л. 25]. Праблема адсутнасці настаўнікаў дапаўнялася нізкім узроўнем падрыхтоўкі тых, хто працаваў у школах вобласці. З 755 настаўнікаў пачатковых класаў 425, або 56 %, не мелі нават сярэдняй адукацыі. З 132 настаўнікаў 5–10 класаў 91 чал. не мелі адпаведнай адукацыі [9, л. 53].

Такое становішча школьнай адукацыі ў вобласці, па меркаванні правяраючай брыгады, было абумоўлена тым, што пытанні аднаўлення сеткі школ і нармалізацыі школьнага навучання ў вобласці не былі ў цэнтры ўвагі абласнога і раённых партыйна-савецкіх кіруючых органаў. Абласны камітэт КП(б)Б на працягу першага вучэбнага паўгоддзя ні разу на сваіх пасяджэннях бюро не абмеркаваў пытанне аб рабоце школ вобласці. Не надавалі належнай увагі школьнай адукацыі і раённыя КП(б)Б. На працягу паўгода 5 з 11 раённых камітэтаў ні разу не разгледзелі стан школьнай адукацыі [9, л. 51].

Мала ўвагі ўдзялялі аднаўленню школьнай адукацыі ў вобласці і выканаўчыя органы ўлады. Многія сельскія саветы зусім не займаліся пытаннямі работы школ, лічачы іх малазначнымі і другараднымі. Асобныя старшыні сельскіх саветаў нават ігнаравалі рашэнні і ўказанні райвыканкамаў па школе [9, л. 53].

Брыгада ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б па праверцы стану школьнай адукацыі Пінскай вобласці зрабіла выснову, што «ў сувязі з адсутнасцю дзейснага кіраўніцтва справай народнай адукацыі з боку партыйных арганізацый

стан работы большасці школ у вобласці нездавальняючы. Закон аб усенавучы не выкананы» [9, л. 47].

Не лепш ішлі справы з аднаўленнем школьнай адукацыі і ў Баранавіцкай вобласці, якой на гэтыя патрэбы было выдзелена 1 299 000 руб. Аднак большая частка гэтай сумы так і не была выкарыстана. У Клецкім раёне з выдзеленых 100 000 руб., выкарысталі толькі 26 291, у Ляхавіцкім раёне з 94 500 руб. – толькі 16 000. А такія раёны, як Мірскі, Стаўбцоўскі, Івянецкі, Карэліцкі, не выкарысталі ні аднаго рубля [10, л. 87]. У выніку адсутнасці кіраўніцтва і кантролю з боку абласных і раённых партыйна-савецкіх органаў, безгаспадарчасці мясцовых структур кіравання народнай адукацыяй на 1 студзеня 1945 г. 383 школы вобласці з 870 працягвалі працаваць у наёмных памяшканнях, а 97 наогул не аднавілі сваю дзейнасць [9, л. 87].

Дрэнна ў вобласці ішла справа і з вырабам школьнай мэблі. Нават у такіх раёнах, як Слонімскі і Навагрудскі, дзе меліся фабрыкі па вырабе мэблі, райкамы партыі і райвыканкамы не прынялі мер для забеспячэння школ партамі і лавамі [9, л. 88].

Закон аб усенавучы ў вобласці таксама не быў выкананы. На 1 студзеня 1945 г. навучаннем не было ахоплена 2167 асоб абавязковага школьнага ўзросту. Акрамя гэтага, на працягу першага паўгоддзя многія з тых, хто прыступіў да заняткаў, перасталі наведваць школу. Напрыклад, у Гарадзішчанскім раёне – 320 чал., Стаўбцоўскім – 220, Ляхавіцкім – 350 чал. [9, л. 88]. Прычынай такога становішча, як адзначыла брыгада, з'явілася тое, «што Баранавіцкі аблвыканкам і райвыканкамы не займаліся пытаннямі ўсенавуча і не прымалі ніякіх мер, папярэджваючых адсеў» [9, л. 89]. Складанае становішча ў вобласці было і з забеспячэннем школ палівам у зімовы перыяд. На год школам вобласці патрабавалася 20 292 куб. м дроў. Падвезена ж было толькі 8467 куб. м. Многія школы наогул засталіся без паліва. Дзеці сядзелі на занятках у паліто, шапках, рукавіцах (Вераб'ёўская пачатковая школа Слонімскага раёна, Слабадская школа Стаўбцоўскага раёна і інш.) [9, л. 89].

Надзвычай складанае становішча ў вобласці было з педагагічнымі кадрамі. На 1 студзеня 1945 г. у вобласці не хапала 530 настаўнікаў: у 1–4 класах – 349, у 5–7 – 139, у 8–10 – 42. Па гэтай прычыне настаўнікі мелі вучэбную нагрузку па 35–50 гадзін. У шэрагу школ асобныя вучэбныя прадметы наогул не выкладаліся [9, л. 91]. З 2799 настаўнікаў 1401 чал. (звыш 50 %) не мелі сярэдняй адукацыі [9, л. 92]. Аб нізкім узроўні пісьменнасці настаўнікаў сведчаць вынікі дыктантаў па беларускай і рускай мовах, разлічаных на вучняў 4-х класаў. Дыктанты праводзіліся Баранавіцкім настаўніцкім інстытутам у Слонімскім раёне. З 166 настаўнікаў, якія пісалі дыктант па беларускай мове, адзнаку «5» атрымалі толькі 6 чалавек, адзнаку «4» – 44, адзнаку «3» – 73, нездавальняючыя адзнакі атрымалі 38 чалавек. З іх 20 атрымалі адзнаку «1». Дыктант па рускай мове на «5» напісалі 11 чалавек, на «4» – 35, на «3» – 64, на «2» – 29, на «1» – 27 [9, л. 92]. Павышэнню граматнасці працуючых настаўнікаў і педагагічнай пісьменнасці магла б садзейнічаць іх вучоба на завочных аддзяленнях Баранавіцкага настаўніцкага інстытута і педагагічных вучылішчаў. Аднак па прычыне недастатковай растлумачальнай работы з боку раённых аддзелаў народнай адукацыі заявы на завочныя аддзяленні, вучэбныя заняткі на якіх пачаліся ў студзені 1945 г., падалі толькі 518 настаўнікаў з 1534, якія не мелі адпаведнай адукацыі [9, л. 94]. У выніку адзначаных вышэй недахопаў у арганізацыі школьнага навучання ў першым паўгоддзі з 96 291 навучэнца 22 042, або 22,9 %, былі непаспяваючымі. З іх па адным вучэбным прадмеце не паспявалі 9494 чал., па двух – 6580, па трох – 4139, больш чым па трох прадметах – 1829 чал. [9, л. 97].

Прыкладна такое становішча з аднаўленнем школьнай адукацыі было і ў іншых абласцях рэспублікі.

Нездавальняючы стан агульнай сярэдняй адукацыі прымусіў СНК БССР і ЦК КП(б)Б прыняць 22 жніўня 1945 г. сакрэтную пастанову № 1163-292с «Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы школ да 1945/46 навучальнага года» [12, л. 157–159]. У дакуменце адзначаліся сур'ёзныя недахопы ў выкананні закона аб усеагульным абавязковым навучанні, недастатковая работа мясцовых выканкамаў па падрыхтоўцы памяшканняў да вучэбных заняткаў і забеспячэнні школ абсталяваннем, мэбляй, палівам, нездавальняючая укамплектаванасць школ педагагічнымі кадрамі, падручнікамі, вучэбна-наглядными дапаможнікамі і школьнымі пісьмовымі прыналежнасцямі [10, л. 157].

З мэтай своечасовай і поўнай падрыхтоўкі школ да 1945/46 навучальнага года і ажыццяўлення закона аб усенавучы СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязаў Наркамасветы БССР і яго органы на месцах правесці да 20 жніўня 1945 г. поўны ўлік дзяцей школьнага ўзросту (7–14 гадоў) і ў адпаведнасці з дадзенымі ўліку ўстанавіць да 25 жніўня бягучага года сетку пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ на 1945/46 навучальны год у разрэзе кожнага раёна; аптымізаваць да 20 жніўня 1945 г. сетку сямігадовых і сярэдніх школ шляхам зліцця школ з неўкамплектаванымі класамі (менш за 10–12 чалавек), стварыць для вучняў, якія жывуць далёка ад школы, інтэрнаты на 15–20 чалавек, забяспечыўшы іх абсталяваннем і палівам; укамплектаваць да 15 жніўня 1945 г. усе школы рэспублікі педагагічнымі кадрамі.

Абкамам і райкамам КП(б)Б і выканкамам абласных і раённых Саветаў дэпутатаў было даручана да 1 верасня 1945 г. вывесці ўсе школы з зямлянак у прыгодныя і адпаведна абсталяваныя для вучэбных заняткаў памяшканні, вызваліць да 20 жніўня ўсе школьныя будынкі, занятыя не па прызначэнні іншымі арганізацыямі і ўстановамі; да 20 жніўня 1945 г. правесці неабходны рамонт усіх школьных будынкаў, школьнага абсталявання, вучэбна-наглядных дапаможнікаў і інш.; да 1 верасня 1945 г. нарыхтаваць і завезці ва ўсе школы паліва на ўвесь ацяпляльны перыяд з улікам патрэб у паліве настаўнікаў.

Адпаведныя даручэнні па забеспячэнні агульнаадукацыйных школ да пачатку навучальнага года падручнікамі, праграмамі, сшыткамі, мэбляй, абсталяваннем, школьна-пісьмовымі прыладамі, вучэбнанаглядными дапаможнікамі, лямпамі, газай былі дадзены іншым наркаматам рэспублікі [10, л. 158, 159].

Трэба адзначыць, што пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б не ўтрымлівала крытычнага аналізу стану школьнай адукацыі. У ёй нават не ўпаміналася аб тым, што ў адпаведнасці з раней прынятымі пастановамі саюзнага і рэспубліканскага значэння аднаўленчы працэс трэба было ўжо завяршыць. У канстатуючай частцы пастановы дамініруюць абцякальныя фармулёўкі «дабіліся значных поспехаў», «амаль поўнасцю выра-

шана», «выраблена некаторае абсталяванне». Пастанаўляючая частка, па сутнасці, дубліравала патрабаванні пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 18 сакавіка 1944 г. «Аб узнаўленні сеткі школ у вызваленых ад нямецкіх акупантаў раёнах БССР», тым самым пацвярджаючы той факт, што задачы, пастаўленыя ў ёй, не былі выкананы. Улічваючы, што пастанова прымалася 22 жніўня 1944 г., не можа не здзіўляць нерэальнасць вызначаных тэрмінаў выканання даручэнняў, дадзеных установам і арганізацыям.

*Заключэнне.* Ні ў якім разе не падвяргаючы сумненню маштабнасць і значнасць працы, праведзенай па аднаўленні школьнай адукацыі на вызваленай тэрыторыі Беларусі ў пасляакупацыйныя гады, трэба адзначыць, што, нягледзячы на прынятыя партыйнымі і савецкімі кіруючымі органамі рэспублікі пастановы, дзейнасць структур асветы, арганізацыйна-гаспадарчыя мерапрыемствы на месцах, актыўны ўдзел грамадскасці, настаўнікаў і вучняў, асноўныя пытанні аднаўлення школьнай гаспадаркі, ахопу навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту, забеспячэння школ педагагічнымі кадрамі да пачатку першага пасляваеннага 1945/46 навучальнага года так і засталіся нявырашанымі ў поўнай меры.

*Літаратура*


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 21.
2. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 34.
3. Освобожденная Беларусь. Документы и материалы : в 2 кн. / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2004. – Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944 / – 398 с.
4. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 6. Спр. 1.
5. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 30.
6. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 32.
7. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 27.
8. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 29.
9. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 28.
10. НАРБ. – Ф. 4сч. Воп. 6. Спр. 6.


*References*


1. Nacyyanal'ny arhiў Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4p. Vop. 17. Spr. 21.
2. NARB. – F. 4p. Vop. 17. Spr. 34.
3. Osvobozhdennaya Belarus'. Dokumenty i materialy : v 2 kn. / sost.: V. I. Adamushko [i dr.]. – Minsk, 2004. – Kn. 1. Sentyabr' 1943 – dekabr' 1944 / – 398 s.
4. NARB. – F. 42. Vop. 6. Spr. 1.
5. NARB. – F. 4p. Vop. 17. Spr. 30.
6. NARB. – F. 4p. Vop. 17. Spr. 32.
7. NARB. – F. 4p. Vop. 17. Spr. 27.
8. NARB. – F. 4p. Vop. 17. Spr. 29.
9. NARB. – F. 4p. Vop. 17. Spr. 28.
10. NARB. – F. 4sch. Vop. 6. Spr. 6.